# РАЗМЕРКАВАННЕ: ЯК ЗАДАВОЛІЦЬ І СВАЕ, І ДЗЯРЖАЎНЫЯ ІНТАРЭСЫ?

**На пытанні, якія датычацца парадку размеркавання і ўладкавання на першым працоўным месцы, адказваюць старшыня прафсаюзных камітэтаў навучэнскай моладзі пры Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, намеснік старшыні ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Раман ДАПІРА і галоўны прававы інспектар працы ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Ларыса МАНЮК.**

**(Працяг. Пачатак у нумарах за 15 і 16 красавіка.)**

**☎ Маладыя людзі (муж і жонка) адначасова заканчваюць Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, навучаюцца па адной спецыяльнасці. Хлопец прынёс у камісію па размеркаванні персанальную заяўку на сябе ад Дома культуры, што ў Дзяржынскім раёне. Жонка — заяўку ад мінскага танцавальнага калектыву. Абодва маюць мінскую рэгістрацыю. Ці павінны ўлічвацца інтарэсы іх сям'і? Ці могуць іх накіраваць на працу ў розныя населеныя пункты ці нават у розныя вобласці, бо такая «перспектыва» ёсць?**

Варта мець на ўвазе, што камісія па размеркаванні адпаведнай установы адукацыі пры прыняцці рашэння аб накіраванні выпускніка бярэ пад увагу вынікі яго паспяховасці, удзел у навукова-даследчай, грамадскай рабоце, стан здароўя, сямейнае становішча, а таксама улічвае рэкамендацыі ўстановы адукацыі аб найбольш мэтазгодным накіраванні гэтага выпускніка на працу і яго асабістыя пажаданні.

У адпаведнасці з пунктам 16 Палажэння аб размеркаванні, выпускнікам (мужу і жонцы), якія размяркоўваюцца адначасова, месца працы пры наяўнасці магчымасці прадастаўляецца ў адным населеным пункце. А ў адпаведнасці з пунктам 20 гэтага дакумента, пры немагчымасці прадастаўлення мужу і жонцы, якія размяркоўваюцца адначасова, месца працы ў адным населеным пункце, ім можа быць дадзена таксама права самастойнага працаўладкавання.

Адносна прыярытэтнасці задавальнення заявак трэба мець на ўвазе, што ў адпаведнасці з пунктам 9 Палажэння аб размеркаванні, у першую чаргу выпускнікі размяркоўваюцца ў дзяржаўныя арганізацыі і арганізацыі з дзяржаўнай доляй уласнасці ў іх статутных фондах згодна з дагаворамі аб падрыхтоўцы спецыялістаў і заяўкам на спецыялістаў з гэтых арганізацый. Персанальныя заяўкі дзяржаўных арганізацый аб размеркаванні на працу да іх канкрэтных выпускнікоў таксама разглядаюцца ў першую чаргу.

У вышэйапісанай сітуацыі пры ўмове, што абедзве арганізацыі, адкуль маладыя людзі прынеслі персанальныя заяўкі, з'яўляюцца дзяржаўнымі, і з улікам іх сямейнага становішча, прапанаваны самімі выпускнікамі варыянт іх працаўладкавання можна разглядаць у якасці найбольш мэтазгоднага іх размеркавання.

**☎ Студэнтка два гады навучалася за ўласныя сродкі, а затым перавялася на бюджэтнае аддзяленне. Ці падлягае яна абавязковаму размеркаванню?**

Падлягае, паколькі размеркаванню падлягаюць усе выпускнікі, якія атрымалі прафесійна-тэхнічную, сярэднюю спецыяльную ці вышэйшую адукацыю першай або другой ступені на дзённай форме атрымання адукацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага і (ці) мясцовага бюджэтаў, акрамя выпускнікоў з кола замежных грамадзян і асобаў без грамадзянства, месцам пражывання якіх з'яўляюцца замежныя дзяржавы (пункт 4 Палажэння аб размеркаванні). Пры гэтым тэрмін работы па размеркаванні не змяншаецца прапарцыянальна часу навучання за кошт уласных сродкаў, гэта значыць, што выпускнік павінен будзе адпрацаваць па размеркаванні столькі ж часу, колькі і ўсе выпускнікі, якія адразу навучаліся на «бюджэце»: пасля атрымання сярэдняй спецыяльнай ці вышэйшай адукацыі — два гады (пункт 5 Палажэння аб размеркаванні).

**Дачка заканчвае Віцебскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт. Будучы стаматолаг. Яе муж — урач-інтэрн, малады спецыяліст, працуе ў Мінску па размеркаванні. У дачкі — рэгістрацыя ў Мінскім раёне. Дзяўчына была пятая па рэйтынгу і тэарэтычна магла выбіраць для сябе будучае месца працы. Але такой магчымасці ёй не далі, паставілі перад фактам — адпраўляешся працаваць ва Узду. Чаму не ўлічвалася месца працы і жыхарства мужа, таксама маладога спецыяліста і ўрача? Няўжо нельга было прапанаваць работу хоць бы у Мінскім раёне? Кожны дзень з Мінска на працу ва Узду не наездзішся...**

Згодна з пунктам 16 Палажэння аб размеркаванні, выпускніку, жонка (муж) якога былі накіраваны на працу па размеркаванні раней, месца працы пры наяўнасці магчымасці прадастаўляецца ў тым жа населеным пункце. Больш за тое, у адпаведнасці з пунктам 20 гэтага дакумента, пры немагчымасці прадастаўлення выпускніку месца працы ў тым жа населеным пункце, дзе ўжо працуе яго жонка (муж), яму можа быць дадзена права самастойнага працаўладкавання. Праўда, у выпускнікоў медыцынскіх навучальных устаноў у гэтым выпадку ўзнікае пытанне з праходжаннем стажыроўкі. Аналіз Палажэння аб размеркаванні і ведамаснай нарматыўнай базе Міністэрства аховы здароўя па гэтым пытанні дазваляе прыйсці да высновы, што ў вашым выпадку неабходна было самастойна весці пошук дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя ў Мінску, Мінскім раёне або ў раёнах, якія мяжуюць са сталіцай і зручных для штодзённага праезду, дзе патрэбны адпаведны спецыяліст і якія гатовы накіраваць універсітэту заяўку аб размеркаванні на працу да іх канкрэтнага выпускніка.

Як мы ўжо казалі вышэй, выпускнікі размяркоўваюцца на працу ў адпаведнасці з атрыманай спецыяльнасцю і прысвоенай кваліфікацыяй у першую чаргу ў дзяржаўныя арганізацыі і арганізацыі з дзяржаўнай доляй у іх статутных фондах. Заяўкі гэтых арганізацый аб размеркаванні на працу да іх канкрэтных выпускнікоў таксама разглядаюцца ў першую чаргу. Такі алгарытм дзеяння дазваляе ўраўнаважыць інтарэсы выпускніцы з інтарэсамі сістэмы аховы здароўя. У выпадку, калі адпаведная заяўка будзе адсутнічаць ва ўстанове адукацыі на дзень пасяджэння камісіі па размеркаванні, мэтазгодна прасіць камісію адкласці размеркаванне гэтай выпускніцы на непрацяглы перыяд да вырашэння пытання аб накіраванні заяўкі. Акрамя таго вы маеце права звярнуцца ў Міністэрства аховы здароўя з просьбай аказаць вам садзейнічанне ў пошуку вакансіі, якая адпавядае вашым інтарэсам, патрэбам сістэмы аховы здароўя і вашаму сямейнаму становішчу. Па падтрымку можна звярнуцца таксама і ў свой галіновы прафсаюз.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

***(Працяг будзе.)***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ